## Кніжны гасцінец

# Усмешка, якую пранеслі скрозь дождж

**Васіль Вітка. Шчыголфлейтыст. Мінск, «Мастацкая літаратура», 2021.**



*«Адкажы, чаму ты, дрозд,*
*Гэтак здорава падрос?*
*— Шмат увосень еў рабіны,*
*Ну, а гэта ж — вітаміны».*

Класіку беларускай дзіцячай літаратуры Васілю Вітку, сапраўднае прозвішча якога Крыско, заўсёды ўдавалася размаўляць з дзецьмі на цікавай ім мове. Недарэмна менавіта ён прыдумаў брэнд часопіса «Вясёлка», дзе працаваў шмат гадоў, — вясёлага персанажа Васю Вясёлкіна. Было на кім адпрацоўваць якасць твораў — у сям'і расло двое дзетак... Вітка і брат Міхася Лынькова, Рыгор Суніца, былі жанатыя на родных сёстрах, прыгажунях з яўрэйскай сям'і.

З пачаткам вайны Васіль Вітка страціў сувязь з жонкай і сваякамі з роднымі толькі незадоўга да Перамогі. Ім цудам удалося ацалець.

Сёлета Васілю Вітку спаўняецца 110 гадоў, і ў выдавецтве «Мастацкая літаратура» выдалі яго зборнік у серыі «Жывая класіка дзецям». Яркія ілюстрацыі Надзеі Барай дапамогуць маленькаму чытачу ўявіць герояў і даць волю ўласнай фантазіі... А пасля з новым імпэтам пачаць даследаваць прыроду роднай Беларусі, услухоўвацца ў галасы птаства... Бо менавіта птушкі — героі гэтага зборніка: амялушка, гарыхвостка, жаўна, круцігалоўка, крыжадзюб... Не ўсе дарослыя пазнаюць іх, убачыўшы ўжывую, а вершы Васіля Віткі дапамогуць дапоўніць імёны крылатых стварэнняў яркімі вобразамі. Кампактнае, бюджэтнае, але пры гэтым якаснае выданне.

**Данііл Хармс. «Аб з'явах і існаваннях». «Азбука», Масква, 2020.**



Памятаеце знакамітае выказванне барона Мюнхаўзена: «Я зразумеў, у чым ваша бяда. Вы занадта сур'ёзныя. Сур'ёзны твар — гэта яшчэ не прыкмета розуму».

Данііл Хармс, у сапраўднасці Ювачоў, увесь час даказваў грамадству гэтую ісціну...

«Жила-была четвероногая ворона. Собственно говоря, у нее было пять ног, но об этом говорить не стоит».

Гэта што? Занадта мудрае альбо занадта дурное?

Калі замест усмешкі падобнае выклікае ў вас жаданне грэбліва падціснуць вусны, лепш ніколі не бярыцеся чытаць Хармса.

Ён, выхаваны ў пабожнай сямі, паслядоўна цвеліў грамадства цынічнымі выказваннямі і эпатажнымі ўчынкамі. Увесь час дэкларуючы сваю нелюбоў да дзяцей, праславіўся цудоўнымі дзіцячымі вершамі, а калі чытаў юным слухачам, яшчэ і паказваў ім фокусы, і дзеці беглі за ім, як за чараўніком...

У зборнік, пра які мы гаворым, увайшла проза Даніла Хармса. Абсурдысцкая, хуліганская, горка-іранічная, добрыя лекі ад пафасу і шаблонаў... Самавіты чалавек ніколі ж не напіша пра сябе:

«Я родился в камыше. Как мышь. Моя мать меня родила и положила в воду. И я поплыл».

Героі яго — маленькія людзі, абсурд якіх, калі ўдумацца, проста гіпербалізаваная нуда існавання. Сусед Мікалай Іванавіч Ступін, у якога тэорыя, што ўсё — дым... Нейкі спадар Дзярняцін, якога на вуліцы муха ўдарыла ў лоб і прайшла праз галаву наскрозь, толькі сілы у мазгах пачуўся... Аляксей Аляксеевіч Аляксееў, які захацеў быць рыцарам, убачыў, як дама спатыкнулася і разбіла каўпак ад настольнай лямпы, вырашыў прынесці сябе ў ахвяру, выскачыў з трамвая і разбіў сабе твар... А калі выматаў словы «сцяг», «фанфара» ці проста «эпалеты», па ягоным твары бегла сляза замілавання. І нават вялікія людзі — накшталт Пушкіна і Гогаля, у гэтым свеце здрабняюцца, прапушчаныя праз прафаннае ўспрыманне, робяцца мізэрнымі мностваmi, радамі клонаў...

Чалавецтва дарэмна надзімае шчокі, сцвярджаючы, што дасягнула вяршынь прагрэсу. Калі ласка, навука ў свеце Хармса:

«Одиннадцать утверждений Даниила Ивановича Хармса...
I утверждение.
Предметы пропали.
II утверждение.
Было: Числовой ряд начинается с 2. Единица не число. Единица первое и единственное совершенство. Первое множество, первое число и первое от совершенства — это 2. (Пифагорова Единица)».

І гэтак далей, са здзеклівым пафасам.

Часцяком зацемкі Хармса, з вельмі вострымі падтэкстамі, бязлітасна «троляць» уплывовыя фігуры эпохі:

«Ольга Форш подошла к Алексею Толстому и что-то сделала.

Алексей Толстой тоже что-то сделал.

Тут Константин Федин и Валентин Стенич выскочили на двор и принялись разыскивать подходящий камень. Камня они не нашли, но нашли лопату. Этой лопатой Константин Федин съездил Ольге Форш по морде. Тогда Алексей Толстой разделся голым и, выйдя на Фонтанку, стал ржать по-лошадиному. Все говорили: «Вот ржет крупный современный писатель». И никто Алексея Толстого не тронул».

Здзек, падобны да сучаснага інтэрнэтаўскага сцёбу, ці не праўда? 1934 год, калі гэта было напісана, такіх жартаў не даравау.

Хармс памёр у турэмнай псіхіярні падчас ленінградскай блакады.

**Выданні для агляду прадстаўленыя кніжнай крамай «Акадэмічная кніга», Мінск, пр. Незалежнасці, 72.**

# СЁННЯ

## Сонца

| | Усход | Заход | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 5.55 | 20.30 | 14.35 |
| Віцебск — | 5.41 | 20.23 | 14.42 |
| Магілёў — | 5.45 | 20.20 | 14.35 |
| Гомель — | 5.45 | 20.13 | 14.28 |
| Гродна — | 6.11 | 20.44 | 14.33 |
| Брэст — | 6.15 | 20.41 | 14.26 |

## Месяц

*Першая квадра 15 жніўня.*
*Месяц у сузор'і Казярога.*

## Імяніны

*Пр.* ПРААБРАЖЭННЕ ГАСПОДНЯЕ. ЯБЛЫЧНЫ СПАС. *Андрэя, Мікалая.*
*К.* *Канстанцыі, Андрэя, Баляслава, Юльяна, Яна.*



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

# ЗАЎТРА




## Даты Падзеі Людзі

### 19 ЖНІЎНЯ

**У краіне**

**1892** год — нарадзіўся Барыс Сяргеевіч Гарбачоў (в. Забалацце, цяпер у Рагачоўскім раёне), савецкі ваенны дзеяч, герой Грамадзянскай вайны, камкор. Браў актыўны ўдзел ва ўстанаўленні савецкай улады ў Ігуменскім павеце, ваенны камісар павета. Удзельнічаў у ліквідацыі антысавецкага бунту корпуса Доўбар-Мусніцкага, у барацьбе з нямецкімі акупантамі. Камандаваў асобным кавалерыйскім палком, кавалерыйскай брыгадай у 1-й Коннай арміі. З 1926 года камандзір брыгады, дывізіі, начальнік і ваенкам Аб'яднанай ваеннай школы імя УЦВК, камандзір і ваенкам навучальных установ Маскоўскай ваеннай акругі. З 1937-га — камандуючы войскамі Забайкальскага, Уральскага ваенных акруг. 3 ліпеня 1937 года быў асуджаны Ваеннай калегіяй Вярхоўнага суда СССР да смяротнага пакарання і ў той жа дзень расстраляны. 14 сакавіка 1956 года рэабілітаваны.

**1910** год — нарадзіўся (г. Сянно) Алесь Жаўрук (Сінічкін Аляксандр Дзмітрыевіч), беларускі паэт. У 1938 годзе скончыў Маскоўскі інстытут гісторыі, філасофіі і літаратуры. З 1939 года ваенны карэспандэнт армейскай газеты «В бой за родину». Аўтар паэтычных зборнікаў «Ручаіны», «Днепро выходзіць з берагоў», паэм «Крывёю сэрца», «Пра майго таварыша» і іншага. Напісаў лібрэта аперэты «Зарэчны барок». Загінуў у 1942 годзе ў баях пад Сталінградам.

**1954** год — нарадзіўся Алег Анатолевіч Івашкевіч, беларускі вучоны ў галіне фізічнай хіміі і высокамалекулярных злучэнняў, акадэмік НАН Беларусі, доктар хімічных навук, заслужаны дзеяч навукі Рэспублікі Беларусь. Аўтар больш за 400 навуковых прац у галіне фізічнай хіміі працэсаў тэрмічнага раскладання і гарэння кандэнсаваных сістэм на аснове палімерных матэрыялаў, а таксама прыкладной квантавай хіміі. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі.

**У свеце**

**1848** год — газета The New York Herald апублікавала першае паведамленне аб знойдзеным у Каліфорніі золаце — так пачалася «залатая ліхаманка», яскрава паказаная пазней у шматлікіх галівудскіх кінакарцінах.



**1920** год — сяляне некалькіх вёсак Тамбоўскай губерні адмовіліся здаваць хлеб прадстаўнікам савецкай улады, пачатак Тамбоўскага паўстання. Часам называецца «антонаўшчынай» па прозвішчы фактычнага кіраўніка паўстання, начальніка штаба 2-й паўстанцкай арміі Аляксандра Антонава. У савецкай гістарыяграфіі — «Антонаўскі мяцеж». Як і Кранштацкае паўстанне, шмат у чым паспрыяла рашэнню аб адмове ад палітыкі «ваеннага камунізму» і пераходзе да нэпа.

**1960** год — савецкі касмічны карабель «Спадарожнік-5» з сабакамі Белкай і Стрэлкай на борце зрабіў сутачны палёт і паспяхова вярнуўся на Зямлю.

**Так гаварылі...**

**АНАТОЛЬ ВЯРЦІНСКІ:**

*«Ад велічы да ганьбы — адзін крок».*

## УСМІХНЕМСЯ

Калі ў моду ўвайшлі суперкароткія шорты і спадніцы, адразу ж стала зразумела, чаму раней жанчыны іх не насілі.

**Часам вышэйшая форма поспеху — гэта абсалютная невядомасць.**

Разумнаму чалавеку два разы паўтараць не трэба. Разумнік цябе ўжо пасля першага разу пашле куды падалей.

**Мільёны палетках хочуць выратаваць нашу планету ад забруджвання.**
**Мільёны іх бацькоў хочуць, каб яны пачалі тое са свайго пакоя.**

Пляж — гэта месца перамогі фізкультуры над маральнасцю.

**Мужчына, памятай: зімой, пад вось гэтым усім, жанчына такая ж, як і ўлетку.**

Мама дасылае так шмат фотак грыбоў, што я ўжо пабойваюся. Здаецца, яны ўзялі кантроль над ёй і цяпер самі фатаграфуюцца.





ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА
ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.
АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.
ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 311 17 13 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 311 17 44, маркетынгу — 263 66 73, бухгалтэрыі — 311 17 16.
прыём рэкламы тэл./факс: 311 17 27, e-mail: reklama@zviazda.by
Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.
Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.
www.zviazda.by
e-mail: info@zviazda.by (для зваротаў): zvarot@zviazda.by
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, праспр. Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.
Тыраж 14.804. Індэкс 63850. Зак. № 2176.
Нумар падпісаны ў 19.30 18 жніўня 2021 года.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12